УДК 37.016

# ЗНАЁМСТВА З БЕЛАРУСКАЙ МІФАЛОГІЯЙ ЯК КАМПАНЕНТ ПАЧАТКОВАЙ ФІЛАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ*

**Васілеўская Алена Станіславаўна**

дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства ўстановы адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)

**Гуцава Дар’я Дзмітрыеўна**

студэнтка 4 курса факультэта пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)

**Анатацыя**. У артыкуле абгрунтоўваецца неабходнасць знаёмства малодшых школьнікаў з беларускай міфалогіяй. Аўтары даказваюць, што набыццё ведаў пра міфічных істот і міфічныя ўяўленні нашых продкаў, будзе спрыяць фарміраванню моўнай, маўленчай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый.

**Ключавыя словы**: міфалогія, лексіка, фразеалогія, малодшыя школьнікі, моўная кампетэнцыя, лінгвакультуралагічная кампетэнцыя

Сучаснаму чалавеку не абавязкова верыць у міфы і ў існаванне міфічных істот. Аднак ведаць пра іх, несумненна, неабходна. Міфалогія самым цесным чынам звязана з мастацтвам, мовай, светапоглядам народа. Міфалагічныя матывы мы знаходзім у кіно, літаратуры, выяўленчым мастацтве, тэатры. Таму вывучэнне міфалогіі павінна стаць важным кампанентам агульнай культуры чалавека. Закладваць асновы гэтай культуры, безумоўна, трэба яшчэ на стадыі пачатковай адукацыі.

Малодшыя школьнікі здольныя хутка і эфектыўна авалодваць новымі ведамі, а знаёмства з міфалогіяй у гэтым узросце спрыяе развіццю фантазіі і творчасці, пазнавальнай актыўнасці і цікавасці да навучання.

* Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (№ ДР 20211209)

Безумоўна, першае, што трэба зрабіць пры вывучэнні міфалогіі ў пачатковай школе, – гэта зацікавіць навучэнцаў інфармацыяй пра міфы. А потым паступова можна падводзіць вучняў да высновы, што міфалогія – гэта не проста выдумка, а пэўная сістэма ўяўленняў пра свет і яго будову.

Вельмі важна пазнаёміць малодшых школьнікаў з міфалогіяй роднай краіны, паколькі толькі яна раскрывае тыя ўмовы, у якіх фарміраваўся этнас, яго светапогляд і характар.

Знаёмства з міфалогіяй у пачатковых класах мае і практычны аспект, бо яно можа стаць важным кампанентам філалагічнай адукацыі малодшых школьнікаў.

Набыццё ведаў пра міфічных істот, у якіх верылі беларусы і звесткі пра якіх захаваліся да нашага часу, дапаможа зразумець і правільна выканаць заданні, прапанаваныя ў падручніках па беларускай мове, літаратурным чытанні і прадмеце "Чалавек і свет. Мая краіна – Беларусь". Нярэдка выкананне такіх практыкаванняў патрабуе дадатковай інфармацыі, якой вучні не заўсёды валодаюць. Таму ўзнікае неабходнасць у лінгвакультуралагічным каментарыі, які дапаможа навучэнцам выканаць прапанаванае заданне і паспрыяе пашырэнню ведаў.

Так, у 2 класе пры вывучэнні тэмы "Правапіс слоў з літарамі е, ё, я" вучням прапануецца практыкаванне з аднакаранёвымі словамі, у якіх назіраецца з'ява якання. Неабходна прачытаць словы і вызначыць у іх націскныя склады. Сярод прыкладаў мы знаходзім групу слоў лес – лясок – лесавік [6, с. 134]. Пры выкананні гэтага задання можна звярнуць увагу навучэнцаў на адрозненне ў лексічным значэнні слоў ляснік і лесавік. І растлумачыць, што лесавік – гэта міфічная істота, гаспадар лесу, які даглядае і ахоўвае лес.

Такія веды спатрэбяцца навучэнцам, напрыклад, у 4 класе. Пры вывучэнні тэмы "Канчаткі прыметнікаў у родным і месным склонах" дзеці павінны прачытаць тэкст і расказаць, хто такія Лесавік і Палявік [8, с. 34]. У якасці дадатковага творчага задання вучням прапануецца ўспомніць або даведацца пра іншых істот, якіх шанавалі нашы продкі.

Лесавік узгадваецца і ў падручніку па літаратурным чытанні для 4 класа пры знаёмстве з байкай "Вадзянік і Лесавік" [3, с. 63]. Прачытаўшы гэтую байку, вучні павінны адказаць на пытанні і паразважаць, чаму Вадзянік і Лесавік выглядаюць пакалечанымі. Тут важна, каб у дзяцей было сфарміравана разуменне пра тое, што існаванне міфічнай істоты цесна звязана з месцам, дзе яна жыве.

У 3 класе пры вывучэнні тэмы "Род назоўнікаў" вучням прапануецца тэкст пра багіню вясны Лялю, з якога яны павінны выпісаць назоўнікі і вызначыць іх род [7, с. 66]. З тэксту дзеці даведваюцца пра тое, хто такая Ляля, як яна выглядае, як яе прыход уплывае на прыроду. У якасці дадатковага задання вучні павінны расказаць, калі нашы продкі адзначалі свята ў гонар Лялі.

Дастаткова вялікі тэкст пра беларускіх духаў і багоў прадстаўлены на старонках падручніка па прадмеце "Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь" [5, с. 51]. Пры вывучэнні тэмы "У што верылі нашы продкі" вучні знаёмяц-

ца з тэкстам, дзе ўзгадваюцца лесуны, хатнікі, вадзянікі, Дажбог, Перун, Вялес. Пасля гэтага дзецям трэба адказаць на пытанне: якім старажытным багам пакланяліся нашы продкі? Гэтае заданне разлічана на тое, што ў вучняў ужо ёсць пэўныя веды пра беларускую міфалогію.

Знаёмства з міфалогіяй дапаможа выхаваць увагу да слова, паспрыяе пашырэнню лексічнага запасу навучэнцаў і развіццю звязнага маўлення, будзе вучыць больш уважліва чытаць тэксты.

Пры вывучэнні тэмы “Канчаткі прыметнікаў у назоўным і вінавальным склоне” ў 4 класе дзецям прапануецца пазнаёміцца з тэкстам “Грыбная сямейка”, у якім ужываецца слова жэўжык у значэнні ‘свавольнік, гарэза’ [8, с. 32]. На наш погляд, вельмі цікавым і карысным для дзяцей будзе каментарый пра тое, што некалі гэтым словам называлі вадзянога бажка, апекуна ракі, які ўяўляўся худым дзедам невялікага росту, вельмі дужым, жывым і спрытным [9, с. 126]. Такая праца будзе спрыяць фарміраванню лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі, развіццю цікавасці да роднай мовы.

Трэба заўважыць, што ў беларускай мове захаваўся шмат лексічных і фразеалагічных адзінак, паходжанне якіх цесна звязана з міфічнымі ўяўленнямі нашых продкаў. Думаецца, што знаёмства з этымалогіяй некаторых з іх паспрыяе развіццю цікавасці да беларускай мовы.

Слова пярун ‘аглушальны ўдар грому’ паходзіць ад імя славянскага бога грому і маланкі Перуна. Пярун лічыцца галоўным богам славянскага пантэона і яго культ быў шырока распаўсюджаны на Беларусі [1, с. 406].

Слова вырай ‘цёплы край, куды вылятаюць на зіму пералётныя птушкі’ па сваім паходжанні цесная звязана з уяўленнямі беларусаў пра рай і райскае дрэва, у вяршынях якога жывуць птушкі і душы памерлых людзей [1, с. 99]. У беларускім фальклоры вядомы матыў “замыкання” і “адмыкання” выраю намеснікамі бога – пчалой ці жаваранкам. Дарэчы, гэты матыў гучыць у вясновай песні “Ты, пчолка ярая”, якая вывучаецца ў 3 класе на ўроках літаратурнага чытання [2, с. 33].

З імем Лялі звязана паходжанне слоў лялька, люлька (калыска) [1, с. 286]. Звычайна Лялю ўяўлялі ў выглядзе юнай, стройнай, прыгожай дзяўчын, адкуль і ўзнікла параўнанне прыгожая, як Ляля, а ў больш познім варыянце прыгожая, як лялька.

Міфалагічныя вераванні сталі асновай стварэння вялікай колькасці фразеалагізмаў. З Перуном звязана з’яўленне фразем як пярун з яснага неба ‘раптоўна, зусім нечакана (здарылася што-н., з’явіўся хто-н. і пад.)’; даць перуноў ‘гнеўна, з абурэннем гаварыць, пагражаць’.

Па меркаванні В.М. Макіенкі, паходжанне фразеалагізмаў давесці (прывесці) да ладу ‘прывесці што-н. у парадак; закончыць паспяхова якую-н. справу.’; дайсці (да) ладу ‘разабрацца, дабіцца толку’; на добры лад ‘так, як патрэбна; па-сапраўднаму’ звязана з імем багіні Лады [4, с. 218]. Лада была вялікай багіняй вяснова-летняй урадлівасці і апякункай шлюбаў [1, с. 275–276]. Этымалагічна яе імя паходзіць ад слоў улада, валодаць, панаваць. Ад кораня лада утвораны лексемы ладзіць, лады, ладна.

Паходжанне фраземы з роду ў род ‘з пакалення ў пакаленне, па спадчыне ад бацькоў да дзяцей (пераходзіць, захоўваецца і пад.)’ звязана з вельмі старажытным, усеагульным богам Родам [1, с. 428]. Для беларусаў вобраз Рода стаў увасабленнем Радзімы, Бацькаўшчыны, родных людзей і разам з тым шчаслівага стану [1, с. 429]. Таму чалавек, пазбаўлены сям’і, Радзімы, нешчаслівы, бяздольны, што адлюстравана ва ўстойлівым выразе без роду, без племені ‘адзінокі, без родных’.

На аснове міфалагічных ўяўленняў нашых продках узніклі фразеалагізмы на краі свету (зямлі) ‘дзе-н. вельмі далёка’, на край свету ‘куды-н. вельмі далёка, абы-куды (пайсці, пабегчы і пад.)’, на чым свет стаіць ‘вельмі моцна (лаяць, крычаць і пад.)’. Іх асновай паслужыла вера ў ў тое, што зямля падобная на вялікую талерку, якую падтрымліваюць рыбы (чарапахі, кіты) [4, с. 258].

Неба, па меркаванні нашых продкаў, складалася з сямі столак, ці ярусаў. На сёмым небе жыве Бог, а людзі бачаць толькі першае неба [1, с. 340]. Гэтыя ўяўленні сталі асновай для з’яўлення фразеалагізма быць на сёмым (дзесятым) небе ‘перажываць, адчуваць вялікую радасць’.

Такім чынам, знаёмства малодшых школьнікаў з асновамі міфалагічных уяўленняў нашых продкаў будзе спрыяць фарміраванню моўнай, маўленчай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый. А веды пра міфічных персанажаў, у якіх верылі нашы продкі, дапамогуць лепш засвоіць лексічны і фразеалагічны матэрыял, абудзяць цікавасць да вывучэння роднай мовы.

## Спіс літаратуры

1. Беларуская міфалогія : энцыклапедычны слоўнік / С. Санько [і інш.] – Мінск : Беларусь, 2004. – 592 с.

2. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэбны дапаможнік для 3 класа ўстаноў агул. сярэдн. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск : Нац. ін-т адукацы, 2017. – Ч. 2. – 118 с.

3. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэбны дапаможнік для 4 класа ўстаноў агул. сярэдн. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск : Нац. ін-т адукацы, 2018. – Ч. 2. – 121 с.

4. Мокиенко, В. М. Образы русской речи : историко-этимологические очерки фразеологии // В. М. Мокиенко. – СПб. : Фолио-Пресс, 1999. – 464 с.

5. Паноў, С. В. Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь : вучэбны дапаможнік для 4 класа ўстаноў агул. сярэдн. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / С. В. Паноў, С. В. Тарасаў. – Мінск : Выд. Цэнтр БДУ, 2018. –166 с.

6. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : вучэбны дапаможнік для 2 класа ўстаноў агул. сярэдн. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацы, 2020. – Ч. 1. – 143 с.

7. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : вучэбны дапаможнік для 3 класа ўстаноў агул. сярэдн. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацы, 2017. – Ч. 2. – 143 с.

8. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : вучэбны дапаможнік для 4 класа ўстаноў агул. сярэдн. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / В. І. Свірыдзенка. – Мінск : Нац. ін-т адукацы, 2018. – Ч. 2. – 130 с.

9. Чароўны свет : з беларускіх міфаў, паданняў і казак. – Мінск : Беларусь, 2023. – 215 с.